АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ
ЦІ ЗАСТАНЕЦЦА АДУКАЦЫЯ НЯРОДНАЙ ДАЧКОЙ? 2 стар.
ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ
ДУДУТКІ — ШЛЯХ ДА КРЫНІЦ... 4—5 стар.
СУСТРЭЧЫ Ў ЕПАРХІЯЛЬНЫМ УПРАЎЛЕННІ
ІДЗЕ БУДАЎНІЦТВА І ЎМАЦАВАННЕ БПЦ 3 стар.

ШМАТГАЛОССЕ
РЭХА МІНУЛАГА 2 стар.
Віктар КАПЫЦЬКО: «У ПАСТАНОЎЦЫ СПЕКТАКЛЯ ДРОБЯЗЕЙ НЕ ІСНУЕ» 5 стар.
МІНСК, ЗАХАРАВА, 28. ДОМ ДРУЖБЫ
ПОГЛЯД НА МІНСК СА ШВЕЙЦАРЫІ 6 стар.

МІЖНАРОДНАЯ СУСТРЭЧА СКАЎТАЎ У МІНСКУ 6 стар.
ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ 3,6 стар.
УРАЖАННІ
Анатоль РАМАНЧУК: «ЗАБУЎЛЕНАЯ ІЛЮЗІЯ ЁСЦЬ ПРАЎДАЙ НАШАЙ» 7 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

13 чэрвеня 2001 года
Цана 110 рублёў

№ 24 (2738)
E-mail: golas_radzimy@tut.by

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі
Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

НА ВЫШЭЙШЫМ УЗРОЎНІ

На працягу двух дзён — 31 мая і 1 чэрвеня — у сталіцы Беларусі праходзілі сустрэчы лідэраў дзяржаў — удзельніц Еўразійскай эканамічнай супольнасці і Садружнасці Незалежных дзяржаў (СНД). Разглядаліся дзесяткі пытанняў эканамічнага і сацыяльнага характару, пытанні культурнага, гуманітарнага, ваенна-палітычнага супрацоўніцтва, адбыўся шэраг двух- і шматбаковых сустрэч-кансультацый.

Зараз распрацавана канцэпцыя рознаўзроўневай інтэграцыі, якая дазваляе ўсім краінам выбраць для сябе найбольш зручны варыянт. Хочаш больш цеснай інтэграцыі — далучайся да Саюза Беларусі і Расіі, хочаш ваеннай — да Дагавора аб калектыўнай бяспецы, настроены на эфектыўнае эканамічнае супрацоўніцтва — у Еўразійскую эканамічную супольнасць, ідэю якой прапанаваў яшчэ ў 1994 годзе Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. Тут, у Мінску, уступіў у сілу падпісаны ў мінулым годзе ў Астане дагавор аб заснаванні гэтага саюза. Яго старшынёй абраны ініцыятар — Н. Назарбаеў. У Саюз увайшлі пяць дзяржаў: Беларусь, Расія, Кыргызстан, Казахстан і Таджыкістан. "Гандлёва-эканамічныя сувязі — адна з ключавых падстаў міждзяржаўнага супрацоўніцтва. Гэта мноства трывалых асноў, якія злучаюць нашы народы і краіны на прынцыпах узаемных інтарэсаў і павагі партнёраў", — заявіў на першым пасяджэнні Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці, якое адбылося ў сталіцы Беларусі, Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Вынікам сустрэчы з'явілася пагадненне аб тым, што на тэрыторыі ўдзельнікаў Еўразійскай эканамічнай супольнасці пачне дзейнічаць зона свабоднага гандлю ўжо з 1 ліпеня гэтага года.

Лідэры дзяржаў па ініцыятыве беларускага боку прынялі Зварот да дзяржаў — членаў ААН аб тым, каб аб'явіць 26 красавіка Міжнародным днём памяці ахвяр радыяцыйных аварый і катастроф і Зварот да народаў дзяржаў — удзельнікаў Садружнасці і сусветнай супольнасці ў сувязі з 60-годдзем пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Апошні дакумент заклікае шанаваць памяць загінуўшых, з павагай ставіцца да ветэранаў, працаўнікоў тылу і ўдоў загінуўшых.

Людміла БАГДАНОВІЧ.

З ПРЭС-ЦЭНТРА

ЦІ ДАПАМОЖА СУСВЕТНЫ БАНК?

Адбылася сустрэча, прысвечаная сумеснай рабоце экспертаў Сусветнага банка (СБ) з беларускімі спецыялістамі па распрацоўцы канцэпцыі адраснай сацыяльнай абароны насельніцтва нашай краіны.

Як вядома, ініцыятыва распрацоўкі Праграмы адраснай сацыяльнай дапамогі малазабяспечаным грамадзянам Беларусі належала кіраўніцтву краіны, якое гэты накірунак сваёй дзейнасці вызначыла як прыярытэтны ў зносінах з Сусветным банкам. Пазіцыя ўрада краіны акрэслілася, як кажуць, не на пустым месцы, бо Беларусь мае грант СБ "Удасканаленне распрацоўкі палітыкі і аналітычных функцый Міністэрства сацыяльнай аховы". У межах яго і працавала сумесная камісія. Зараз эксперты СБ і Беларусі ў гэтым накірунку зрабілі толькі нейкія высновы, канкрэтны ж дыялог з кіраўніцтвам Беларусі адбудзецца ў сярэдзіне чэрвеня, калі нашу краіну наведае камісія Сусветнага банка.

Па словах Галіны Саціравай, куратара сацыяльных праграм СБ, сістэма сацабароны насельніцтва на Беларусі недастаткова выкарыстоўвае дзяржсродкі. Таму яна патрабуе ўдасканалення: у прыватнасці, неабходна яе распрацоўваць у плане адраснасці, каб дапамогу атрымлівалі менавіта тыя

— Заканчэнне на 2-й стар. —

ЗАХАВАЙ ТРАДЫЦЫЮ

РУСАЛЬНЫ ТЫДЗЕНЬ

"...А то былі шчэ русалкі. Сама голая, страшная, валасы доўгія цягнуцца па гоні. І ў яе, кажуць, усё як у чалавека...

Гулялі яны больш на гранай нядзелі. Возьме на бярозу залезе, валасамі прывяжацца, уніз апусціцца, гушкаецца і крычыць: "У-гу, у-гу, у-гу!" Так распавядае пра русалак паданне, запісанае ў вёсцы Балсуны Рагачоўскага павета.

Па ўяўленні беларусаў, русалкі — гэта душы памерлых дзетак, якія былі нехрышчонымі, душы тапельцаў, а таксама людзей, што загінулі на русальным тыдні. Яны быццам бы жывуць у рэках і азёрах, адкуль выходзяць адзін раз у год пасля Сёмухі, і на працягу тыдня бавяцца, гуляюць на палях, у гаях, каля рэк і азёр. Называецца гэты тыдзень у народным календары — русальны.

Сярод беларускіх абрадаў русальнага тыдня самы вядомы ў наш час абрад провадаў русалкі. Яе ролю выконвае дзяўчына. Русалка ганяецца за дзяўчатамі, а тыя ўцякаюць, затым водзяць карагод вакол русалкі.

У Гомельскім павеце дзяўчыне распускалі косы, здымалі з яе адзенне і плялі з хмелю вялікі вянок. Апляталі гэтым вянком усё цела і вялі дзяўчыну ў жыта. Гэта было рытуальнае шэсце. У час яго палілі агні, барабанілі ў дошкі, у засланкі.

У іншых мясцінах рабілі чучала русалкі. Калі, выканаўшы ўсе абрады, русальніцы вярталіся дадому, маладыя хлопцы перапынялі іх, перавязвалі вяроўкамі вуліцу, аблівалі вадой і г. д.

Прысутнасць русалкі на зямлі — варожая чалавеку і небяспечная. Пра русалку расказваюць, што яна здольная заманьваць да сябе людзей і можа заказытаць да смерці.

З русальным тыднем звязаны ў народзе некаторыя перасцярогі ахоўнага характару: забаранялася купацца, хадзіць у лес, да возера, ракі, "каб не забралі русалкі". Існавалі і іншыя павер'і: у аўторак кожная дзяўчына ішла да жыта, знаходзіла свой вянок і прыносіла на агарод, дзе былі градкі з капустай. Вянок разрывала і клала між капустай, каб не было чарвякоў.

У беларускім народным календары русальны тыдзень завяршаў вясенні цыкл песеннай паэзіі.

На гранай нядзелі
Русалкі сядзелі.
Ой, рана-рана,
Русалкі сядзелі...

Русалкі сядзелі,
На дзевак глядзелі.
Ой, рана-рана,
На дзевак глядзелі...

Паслухай-ка, пташка,
Што нам Бог гавора.
Ой, рана-рана,
Што нам Бог гавора...

Падрыхтаваў **Мікола КОТАЎ.**
Малюнак **Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.**

НОВЫЯ КЛАСЫ ДЛЯ ЛІЦЭІСТАЎ (Працяг тэмы на 2-й стар.).

У апошнія дні вясны ў Мінску ў самым цэнтры горада адкрыўся новы навучальны комплекс ліцэя Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ліцэй існуе ўжо 11 гадоў і з'яўляецца адной з самых прэстыжных сярэдніх навучальных устаноў на Беларусі. Штогод 99 працэнтаў выпускнікоў ліцэя паступаюць у ВНУ. Паказальна, што на міжнародных і рэспубліканскіх прадметных алімпіядах ліцэісты заваявалі больш за 460 дыпломаў. Абсалютны чэмпіён свету па матэматыцы 2000 года Аляксандр Усніч — леташні выпускнік ліцэя, а цяпер студэнт БДУ.

На ўрачыстасцях, прымеркаваных да адкрыцця новага будынка ліцэя, прысутнічалі не толькі выкладчыкі і навучэнцы ліцэя і БДУ, але і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, мэр сталіцы Міхаіл Паўлаў, міністр адукацыі Васіль Стражаў.

НА ЗДЫМКУ: так выглядае цяперашні будынак ліцэя Белдзяржуніверсітэта.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

ПОГЛЯД У БУДУЧЫНЮ

Першыя вынікі падвёў створаны нядаўна ў Гомельскім аблвыканкаме спецыяльны фонд па сацыяльнай падтрымцы таленавітых дзяцей. Ушаноўвалі лаўрэатаў — 20 навучэнцаў школ і вучылішчаў. У іх ліку і Аню СІДАРЭНКА з абласнога ліцэя, што прадставіла сваю распрацоўку па праблеме экалогіі Гомеля. Даклад яе прагучаў на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, дзе быў адзначаны дыпломам. Разам са сваім навуковым кіраўніком, выкладчыкам ліцэя Святланай Бісевай, Аня занята зараз біяіндэксацыяй глеб. Яе новая распрацоўка мае і практычнае прымяненне.

Фота **Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА**, БелТА.

АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ

ЦІ ЗАСТАНЕЦЦА АДУКАЦЫЯ НЯРОДНАЙ ДАЧКОЙ?

Беларускі парламент актыўна абмяркоўвае праект новага Закона Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Яшчэ летась у Палату прадстаўнікоў паступіў варыянт закона, прапанаваны Прэзідэнтам. На працягу года над праектам працавала Пастаянная камісія па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу. На заключнае пашыранае пасяджэнне па гэтаму пытанню былі запрошаны і журналісты.

Дзеючы Закон аб адукацыі прыняты ў 1991 годзе. Сённяшнія рэаліі патрабуюць унясення ў яго шэрагу змяненняў. Адна з галоўных заган цяперашняга дакумента — спроба ўнесці ў яго ўсё, што тычыцца адукацыі: дашкольнай, сярэдняй, вышэйшай. Па словах міністра адукацыі Беларусі Васіля Стражава, акрамя базавага закона, патрэбны нарматыўныя акты, якія тычацца кожнага раздзела адукацыі асобна. Фінансаванне сістэмы адукацыі ў краіне міністр ацаніў наступным чынам: "2000 год паказаў: выдаткі на адукацыю не могуць быць ніжэйшымі, чым летась. У адваротным выпадку пачнецца распад сістэмы. У мінулым годзе дзяржаўных сродкаў хапіла толькі на зарплату настаўнікам".

Сапраўды, афіцыйныя даныя сведчаць: заработная плата работнікаў галіны ў 2000 годзе склала каля 44,4 тысячы рублёў (па сённяшняму курсу — меней сарака долараў ЗША). Калі ў 1996 годзе ўдзельная вага сярэдняй зарплаты ў сферы адукацыі адпавядала 73,8 працэнта ў адносінах да такога ж паказчыка ў прамысловасці, то ў 1999 — 58,7, а летась — 60,9 працэнта. Такім чынам, зарплата настаўнікаў не дасягнула пражытачнага мінімуму, устаноўленага ўрадам. Да апошняга часу мы чулі, што ледзь не галоўнае дасягненне айчыннай эканомікі ў тым, што зарплата ў дзяржаўным сектары, няхай і невялікая, але плаціцца своечасова. Але на справе затрымкі ў выплаце настаўнікам заробленых грошай ужо здараліся ў Віцебскай, Магілёўскай абласцях.

Каб зарабіць на жыццё, педагогі вымушаны працаваць на паўтары-дзве стаўкі. Такім чынам, атрымліваецца агульная перагрузка настаўнікаў, у выніку якой церпяць і дарослыя, і дзеці. Падае прэстыж працы педагога. З гэтай прычыны каля 40 працэнтаў выпускнікоў педагагічных ВНУ (каля 3 000 чалавек), што навучаліся за кошт дзяржавы, не даязджаюць да месца размеркавання. Маладыя людзі шукаюць любую іншую працу, якая б дала магчымасць зарабіць у сённяшніх складаных умовах.

У сістэме адукацыі расце колькасць пенсіянераў. Па словах намесніка старшыні камісіі Уладзіміра Здановіча, 15 працэнтаў вясковых настаўнікаў — старэйшыя за 50 гадоў. Гэта азначае, што ў бліжэйшы час вясковая школа згубіць пятую частку кадраў. Ужо цяпер у многіх такіх школах няма каму вучыць дзяцей замежным мовам, займацца іх фізічным выхаваннем. З'яўляецца фактам разрыў ва ўзроўні ведаў паміж выпускнікамі гарадскіх і вясковых школ. Сёлета як рашэнне праблемы ўведзены раздзельны конкурс для гараджан і вяскоўцаў пры паступленні ў ВНУ. Але, як падкрэсліў Уладзімір Здановіч, сапраўднае выйсце са становішча — у стварэнні спрыяльных умоў працы педагогаў. Парламенцкая камісія лічыць неабходным занатаваць у законе льготы вясковым настаўнікам, у тым ліку магчымасць бясплатнага прадастаўлення жылля. Дарэчы, так раней і было. Але ў 1995 годзе гэтую прававую норму адмянілі. Недастатковасць фінансавання сферы адукацыі падрывае матэрыяльную базу навучальных устаноў. Іншы раз у школах няма нават крэйды. Прыводзіўся прыклад тэхнікума ў Мар'інай Горцы, дзе ў лабараторыях карыстаюцца абсталяваннем выпуску 1967 года.

Цікава, што ўжо даўно "касметычны" рамонт у школьных класах робіцца за кошт бацькоў. Яны ж плацяць і за карыстанне падручнікамі. Здаецца, сістэма адукацыі функцыяніруе: працуюць дзіцячыя садзікі, быццам бы хапае школ і г. д. Але рэальнасць такая: за апошнія дзесяць гадоў па розных прычынах у краіне закрыліся 800 школ.

Зыходзячы з названых фактаў, члены камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу прапанавалі заканадаўча зафіксаваць нарматыў выдаткаў на адукацыю з дзяржбюджэту — не меней за 10 працэнтаў ад унутранага валавога прадукту (цяпер гэты паказчык знаходзіцца ў межах 5,5 працэнта). Камісія разумее складанасць эканамічнай сітуацыі ў краіне. Аднак, калі зыходзіць толькі са складанасцей і факта, што ў краіне няма грошай, сістэма адукацыі не зрушыць наперад.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Наталля Машэрава падкрэсліла: трэба думаць пра тое, што прымусіць эканамічную сістэму працаваць так, каб сфера адукацыі перастала знаходзіцца ў ролі нярожнай дачкі. Закон, па меркаванні дэпутата, не можа мець аднадзённае гучанне, ён павінен быць разлічаны на перспектыву.

Алена СПАСЮК.

З ПРЭС-ЦЭНТРА

Пачатак на 1-й стар.

грамадзяне нашай краіны, хто ў ёй сапраўды мае патрэбу. Маецца ў кіраўніцтва Беларусі і праблема з акрэсленнем катэгорый насельніцтва, якім патрабуецца тэрміновая дапамога.

Неабходна дадаць, што, на думку намесніка міністра працы Рэспублікі Беларусь Алены Колас, у вырашэнні сацыяльнага пытання ўрад краіны, хоць і пайшоў наперад, ягоная работа раней была толькі на ўзроўні дыскусій. Сапраўдная праца распачалася толькі пасля таго, як з'явілася зацікаўленасць рэфармаваць беларускую сістэму сацабароны з боку СБ. Дарэчы, усе выдаткі, якія пайшлі на работу экспертаў, узяла на сябе гэтая сусветная ўстанова. Так што падаткаплацельшчыкі тут не пацярпелі.

Усім, зразумела, адразу дапамагчы немагчыма. 530 тысяч беларусаў маюць патрэбу ў дапамозе менавіта адраснай. На думку экспертаў камісіі, прычыну беднасці трэба шукаць у рынку працы. Менавіта ён павінен быць сродкам пераадолення галечы.

СПАЧАТКУ — БІЗНЕС, ПОТЫМ — ВУЧОБА

У айчынным Інстытуце прыватызацыі і менеджменту (ІПМ) у верасні бягучага года распачне работу новая для Беларусі Праграма "Executive MBA" (MBA). З гэтай нагоды і адбылася сустрэча супрацоўнікаў ІПМ з журналістамі.

Па словах кіраўніка інстытута Зміцера Дзічкоўскага, MBA — новая для нашай краіны праграма прафесійнай бізнес-падрыхтоўкі, а таксама развіцця кампетэнцыі топ-менеджэраў. Яна створана для ўзмацнення камунікацый у бізнес-асяроддзі і прадугледжвае павышэнне кваліфікацыі менавіта вышэйшага кіраўніцтва кампаній. Гарантам добрага навучання, трэба думаць, можна лічыць васьмігадовы вопыт ІМП на рынку бізнес-адукацыі, а таксама партнёраў інстытута ў ЗША і Польшчы: Універсітэт штата Канектыкут і Акадэмію менеджмента ў Варшаве, адпаведна.

Сярод мэт Праграмы — сучасныя методыкі кіравання бізнесам, навучанне прадпрымальнікаў прымаць рашэнні ў хутка зменлівых абставінах. У тым, што Праграма будзе мець поспех, можна ўпэўніцца яшчэ і з наступнага: "Executive MBA" максімальна набліжана да амерыканскай і канадскай праграм.

Усе элементы Праграмы ўяўляюць лагічна звязаны "ланцужок" ведаў. Для груп навучэнцаў падабраны спрыяльны фармат навучання, які дазваляе вызначаць час на рабоце, у сям'і і на вучобе... Праграма складаецца з трох пластоў навыкаў, якія, на думку работнікаў ІПМ, неабходны прадпрымальнікам для паспяховай арганізацыі бізнесу: асабістая эфектыўнасць, наладжванне ўнутраных бізнес-працэсаў і работа са знешнім асяроддзем кампаніі.

Будучым слухачам Праграмы прапанаваны 18 абавязковых курсаў, а таксама спецыяльныя семінары на выбар з мэтаю павышэння ўласнай эфектыўнасці ў працы. Пачнецца вучоба трохдзённым семінарам за горадам. Мэта яго — развіццё навыкаў каманднай работы, паляпшэнне ўзаемаразумення, псіхалагічнай і інтэлектуальнай інтэграцыі ўдзельнікаў курсаў. Па заканчэнні іх навучэнцы атрымаюць сертыфікат Універсітэта штата Канектыкут... Дарэчы, як сведчыць адпаведнае апытанне, 47 працэнтаў прадпрымальнікаў жадаюць асвойваць новыя накірункі дзейнасці.

Алесь МЯСНІКОЎ.

ШМАТГАЛОССЕ

РЭХА МІНУЛАГА

У РЭСПУБЛІКАНСКІМ ЦЭНТРЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР АДБЫЛАСЯ ВЕЧАРЫНА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКАГА ЗГУРТАВАННЯ ТАТАРАЎ "ЗІКР-УЛЬ-КІТАБ" З НАГОДЫ 57-Й ГАДАВІНЫ ДЭПАРТАЦЫІ ТАТАРСКАГА НАРОДА З ПАЎВОСТРАВА КРЫМ У СТЭПЫ КІРГІЗІІ І КАЗАХСТАНА.

У Беларусі татары пачалі пасяляцца больш як 600 год назад, маючы дазвол князёў Вялікага княства Літоўскага на асадніцтва пры ўмове службы ў войску. Уцёкі татараў у ВКЛ тлумачыліся міжусобіцамі ханаў у Залатой Ардзе і Крыме. Многія з сучасных беларускіх татараў сапраўды вядуць свой радавод ад крымчакоў, што пацвярджаецца звесткамі з старадаўніх кніг — кітабаў.

Трагедыя крымскіх татараў, 40 працэнтаў якіх былі знішчаны ў час сталінскага генацыду, успрымаецца беларускімі татарамі як агульнае гора.

Жалобная вечарына пачалася згодна з мусульманскай традыцыяй — з чытання суры з Карана. А чытаў яе маленькі хлопчык Максім Гормаш, унук вядомай у нас мастачкі Айшы Александровіч.

Як сімвал вернасці Беларусі прагучаў гімн "Магутны Божа" і ўпершыню намі пачуты гімн крымскіх татараў "Я даў клятву" ў перакладзе В. Жуковіча. Спяваў гурт "Тарначык" ("Жураўлік") згуртавання "Зікр-уль-Кітаб".

На экране высвеціліся краявіды Крыма — Сімферопаль, Бахчысарай, руіны Херсанеса са збораў Лявона Калядзінскага, выкладчыка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка, а маленькія артысты Насця Капуста і Максім Гормаш выканалі татарскі танец "Канатнар" ("Крылцы"). У гэтай настальгічнай атмасферы дарэчы і вельмі шчымліва прагучалі радкі Максіма Багдановіча, напісаныя ім у Крыме, калі паэт паміраў ад сухотаў і марыў аб Радзіме:

У кожным краю ёсць крыніцы
Жывой вады.
Там толькі я магу пазбыцца
Свае нуды...

Рэха дэпартацыі крымскіх татараў дакацілася ў пасляваенныя гады і да Беларусі. Прэзідэнт Беларускага грамадскага згуртавання татараў "Зікр-уль-Кітаб" і сябра Сусветнага кангрэса татараў Абу-Бякір Шабановіч згадаў, як пад пагрозай такой жа меры пакарання савецкія ўлады вымушалі татараў мястэчка Іўе ўступаць у калгасы і як спачувалі ім беларусы.

Сын аднаго з дэпартаваных крымскіх татараў Юнус Сятараў расказаў, што яго маці была партызанкай у Крыме, а бацька ў той час ваяваў у Чырвонай Арміі. Але ніхто не пашкадаваў яго сям'ю, усе апынуліся ў выгнанні. Потым яму, маладому хлопцу, не ўдавалася паступіць на вучобу. Толькі ў Беларусі яго ніхто не папракнуў, што ён з крымскіх татараў. Тут Юнус атрымаў вышэйшую адукацыю, тут працуе і жыве.

Успомнілі на вечары аксакала Ісмаіла Меметава, таксама крымскага татарына, лепшага сябра згуртавання беларускіх татараў. Ён вучыў іх размаўляць і чытаць на роднай мове, спяваць песні.

Доктар гістарычных навук Л. Лыч адзначыў, што трагедыя крымскіх татараў мае планетарны маштаб. Гэты народ больш чым на паўстагоддзя быў вырваны з сусветнай супольнасці. Ведаючы яго таленавітасць, можна толькі здагадвацца аб тых культурных здабытках, што маглі б быць унесены ў скарбніцу свету.

На вечарыне прысутнічалі прадстаўнікі пасольстваў Ірана і Турцыі.

Віктар МАЦЮШЭНКА.

СУСТРЭЧЫ Ў ЕПАРХІЯЛЬНЫМ УПРАЎЛЕННІ

ІДЗЕ БУДАЎНІЦТВА І ЎМАЦАВАННЕ БПЦ

Дваццаць чацвёртага чэрвеня адзначаецца свята Сабора ўсіх беларускіх святых. У гэты дзень краіну наведае, ужо чацвёрты раз, Свяцейшы патрыярх Аляксій.

Сёлета патрыярх прыбудзе ў Брэст, дзе возьме ўдзел у асвячэнні новага храма ў гонар Уваскрэсення Хрыстова ў памяць Вялікай Перамогі ў другой сусветнай вайне. Дарэчы, настаяцель храма протаіерэй Яўгеній Парфянюк у гэтым годзе атрымаў прэмію "За духоўнае адраджэнне". У Брэсце патрыярх Аляксій наведае помнік гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — Брэсцкую крэпасць-герой. Там пройдзе асвячэнне прастола і помніка пагранічнікам, якія ў першыя дні і гадзіны гітлераўскага нападу абаранялі заходні рубеж, богаслужэнне ў старадаўнім гарнізонным храме ў гонар свяціцеля Мікалая, якое будзе весці асабіста Свяцейшы патрыярх.

Потым шлях шаноўнага госця праляжа далей на Палессе, на ўсход, — на Гомельшчыну. Патрыярх зробіць прыпынак у Іванаве і наведае мясцовы дом міласэрнасці, дзе па два-тры месяцы жывуць цяжкахворыя адзінокія людзі. Наступнае знаёмства — на тураўскай зямлі — з першым на Беларусі храмам у выпраўчай калоніі для зняволеных.

Тураўская праваслаўная епархія — адна з найбольш старажытных на Беларусі, тут на Барысаглебскіх могілках Турава знаходзіцца месца пахавання беларускага златавуста, свяціцеля Кірылы Тураўскага.

Сучаснае жыццё рэгіёна азмрочана цяжкімі наступствамі чарнобыльскай трагедыі. Менавіта ў гэтай епархіі, куды ўваходзяць найбольш забруджаныя радыяцыяй участкі, назіраецца значная актыўнасць у рэгістрацыі праваслаўных прыходаў і храмавым будаўніцтве. У пачатку бягучага года тут ужо было 56 прыходаў: 16 гарадскіх і 40 вясковых. Летась у палескай глыбінцы — гарадскім пасёлку Лельчыцы адкрыўся Свята-Троіцкі храм у памяць 2000-годдзя Нараджэння Хрыстова, што стала значнай падзеяй для ўсёй епархіі.

На Гомельшчыне патрыярх Аляксій прыбудзе на мяжу трох краін — Беларусі, Расіі і Украіны, дзе ўсталяваны манумент дружбы. Мяркуецца, тут кіраўнік Рускай праваслаўнай царквы атрымае каштоўны падарунак ад беларусаў — харугвы для храма Хрыста Збавіцеля ў Маскве. Гэтыя харугвы — дакладныя копіі тых, што калісьці там знаходзіліся і былі знішчаны разам з храмам пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года.

Візіт на Беларусь Свяцейшага патрыярха Аляксія абмяркоўваўся на пасяджэнні Сінода БПЦ. Гэта было першае, але не адзінае пытанне, вынесенае ў парадак дня. Акрамя гэтага, Сінод адобрыў тэкст сінадальнага паслання ў сувязі з тысячагоддзем Друцка, дзе калісьці быў збудаваны першы хрысціянскі храм на тэрыторыі Беларусі. Сінод вырашыў адрадзіць таксама Віцебскі Свята-Духаў жаночы манастыр, заснаваны яшчэ ў 1350 годзе і пазней літаральна сцёрты з твару зямлі. Горад ужо выдзеліў пад манастыр тры будовы, а пяць манахінь утварылі першае сястрыцтва. Як зазначыў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, "будаўніцтва царквы ідзе і ў духоўным, і ў матэрыяльным плане".

Галіна УЛІЦЁНАК.

НА ЗДЫМКУ: у час пасяджэння Сінода БПЦ.

Фота **І. КАМІНСКАГА.**

АХОВА ЗДАРОЎЯ

НЕ КУРЫЦЬ!

Міністэрства аховы здароўя Беларусі ўнесла ў праект нарматыўнага акта, які зараз знаходзіцца на разглядзе ў Савеце Міністраў, прапановы па жорсткай забароне курэння ў грамадскіх месцах.

Прапануецца забараніць курэнне ва ўстановах адукацыйных, культурных, фізкультуры і спорту, у аб'ектах гандлю і бытавога абслугоўвання, арганізацыях грамадскага харчавання, ва ўсіх відах грамадскага транспарту, на прыпынках, у падземных пешаходных пераходах, а таксама на працоўных месцах і ва ўстановах.

Дарэчы, па сацыялагічных даных, сёння ў Беларусі курыць больш паловы дарослага насельніцтва.

Ігар ЧАРТКОЎ.

КАЛЯНДАР

Пачатак у № 22.

19 чэрвеня 90 год з дня нараджэння Фёдара ФЁДАРАВА (1911—1995), буйнога вучонага-фізіка, акадэміка НАН Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі і Дзяржаўнай прэміі СССР.

Асноўныя яго працы — па крышталаоптыцы, тэорыі электрамагнітных і пруткіх хваль у крышталях, тэорыі элементарных часцінак, квантавай тэорыі поля, квантавай тэорыі, тэорыі гравітацыі. Прапанаваў універсальную метрычную фармулёўку нелінейных ураўненняў гравітацыйнага поля Эйнштэйна і іншых фундаментальных фізічных палёў. Адкрыў з'яву папярочнага зрушэння светлавога промня пры адлюстраванні.

◆

21 чэрвеня 1741 года нарадзіўся Жан Эмануэль ЖЫЛІБЕР (памёр у 1814), французскі і беларускі натураліст, хірург і анатам.

Ён скончыў медыцынскі факультэт універсітэта ў Манпелье і працаваў ў Ліенскім каледжы. З 1775 па 1781 год жыў і працаваў у Гродне, дзе заснаваў медыцынскую акадэмію, акушэрскую і ветэрынарную школы, клінічны шпіталь, батанічны сад. У 1781—1783 гадах працаваў прафесарам натуральнай гісторыі Вышэйшай літоўскай школы ў Вільні. У 1783 годзе вярнуўся ў Францыю, дзе прымаў удзел у рэвалюцыі 1789—1794 гадоў. Напісаў работы па флоры Беларусі, Літвы, Польшчы, па эпідэміялогіі эндэмічных хвароб у гэтых краінах.

◆

30 чэрвеня 1881 года нарадзіўся Павел РАСТАРГУЕЎ (памёр у 1959 годзе), рускі і беларускі мовазнавец і педагог, правадзейны член Інбелкульта.

П. Растаргуеў — выхадзец з сям'і служачых, у 1908 годзе скончыў Маскоўскі універсітэт, працаваў у ВНУ Масквы. У 1938—1951 гадах — загадчык кафедры рускай мовы Навазыбкаўскага педагагічнага інстытута. У 1918 годзе ў Беларускім народным універсітэце чытаў курс лекцый па беларускай мове. З таго часу беларуская мова стала галоўным аб'ектам яго даследаванняў. Вывучаў гаворкі, пераходныя ад беларускай мовы да рускай.

◆

30 чэрвеня спаўняецца 90 год з дня нараджэння Аляксандра ІПАЦЬЕВА (1911—1969), вучонага-генетыка і селекцыянера, члена-карэспандэнта НАН Беларусі. Апошняя пасада — загадчык кафедры пладаводства Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Асноўныя навуковыя працы прысвечаны сістэматызацыі, селекцыі, насенняводству пладова-агароднінных культур. Вёў даследаванні па вывучэнні сусветнага багацця агароднінных культур.

Падрыхтавала **Ларыса КАРАЧУН.**

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

23 мая 2001 года ў актавай зале Прыдняпроўскага дзяржаўнага універсітэта, а днём пазней у Палацы Рэспублікі горада Цірасполя адбылося ўрачыстае адкрыццё Дзён славянскага пісьменства і культуры ў Прыднястроўі.

Свята, якое штогод праходзіць у Цірасполі, фарміруе імкненне да брацкага адзінства, любові і павагі да гісторыі і культуры славянскіх краін.

Святочныя мерапрыемствы закранулі практычна ўсе бакі культурнага жыцця Прыднястроўя. У кінаканцэртным комплексе "Цірасполь" адбыўся прагляд фільмаў. Дзяржаўны сімфанічны аркестр ПМР выступіў з канцэртам "Славянская музычная класіка". У парку культуры і адпачынку "Перамога" праходзіў фестываль народнай творчасці "Фальклорнае мнагаквецце". Музеі, тэатры, бібліятэкі, выставачныя залы — усюды знайшло адлюстраванне гэтае свята.

У святочнай праграме прынялі ўдзел прадстаўнікі славянскіх абшчын Прыднястроўя. Сярод іх члены Таварыства беларускай культуры (кіраўнік Тамара Ломцева).

Не абышоў увагаю гэтае свята пасол Беларусі ў Рэспубліцы Малдова В. Саковіч.

У апошні дзень святкавання на сцэне ціраспальскага Палаца Рэспублікі выступілі творчыя калектывы з Расіі, Беларусі, Украіны і Прыднястроўя.

Кульмінацыяй вечара стала выступленне ансамбля песні, музыкі і танца "Талака" Віцебскай абласной філармоніі. Аказала падтрымку ў арганізацыі паездкі творчага калектыву ў сталіцу ПМР пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова. Прыднястроўскія гледачы з вялікай любоўю і цеплынёй сустрэлі выступленне беларускіх артыстаў. Хочацца верыць, што такія канцэрты ў Прыднястроўі стануць добрай традыцыяй.

Вераніка ЮХНАВЕЦ.

Цірасполь.

ЛЁСЫ

ПАРОДНЕНЫ З БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦЮ

У горадзе Яраслаўлі жыве абаронца Брэсцкай крэпасці Іван Раманькоў. Ён нарадзіўся ў кастрычніку 1918 года ў вёсцы Ніжнія Мохавічы Смаленскай вобласці. Пасля заканчэння сямігодкі працаваў у калгасе, а ў лютым 1940 года яго мабілізавалі ў Чырвоную Армію і накіравалі служыць у Брэсцкую крэпасць.

26 чэрвеня нямецкія танкі былі ўжо ў Мінску, а абаронцы Брэсцкай крэпасці пачалі аперацыю па прарыву варожага кальца, але беспаспяхова. Ад 150 чалавек пасля аперацыі засталося толькі сорак. 28 дзён абаронцы цытадэлі былі без вады, але стаялі насмерць. На 14-ты дзень вораг падцягнуў цяжкія гарматы, білі прамой наводкай па тунэлях. Цяжкапаранены Іван Якаўлевіч страціў прытомнасць. Калі свядомасць вярнулася да яго, вакол ужо былі фашысты. Так 9 ліпеня 1941 года сяржант Раманькоў апынуўся ў лагеры для ваеннапалонных у Бяла-Падлясцы. Ад 2 000 ваеннапалонных у гэтым лагеры ў жывых засталося толькі каля 200 чалавек.

У верасні 1941 года Іван Якаўлевіч разам са сваім аднапалчанінам Васілём Васільевым уцёк з палону. Некалькі сутак галодныя ішлі яны на ўсход, спадзеючыся натрапіць на партызанскі атрад. На трэці дзень вечарам зайшлі ў польскую хату, але былі схоплены фашыстамі. Моцна збіты Іван Якаўлевіч быў адпраўлены ў лагер пад Брэстам. Там ваеннапалонныя дзесяткамі паміралі ад тыфу. Восенню 1943 года палонных, якія яшчэ засталіся ў жывых, размеркавалі па розных канцэнтрацыйных лагерах. Раманькоў трапіў у жудасны Бухенвальд.

Паўторна ўдалося ўцячы толькі ў лютым 1945 года.

Да жніўня 1946 года служыў у мінамётным палку ў горадзе Магдэбургу, потым дэмабілізаваўся. Маці сустрэла яго каля зямлянкі. З братам пабудавалі дом, а ў 1948 годзе пераехаў з жонкай у Яраслаўль да яе родных, дзе і жыве па сённяшні дзень. У тыя гады запіс у ваенным білеце "быў у палоне" не даваў магчымасці працаўладкавацца, але потым узялі загадчыкам гаспадаркі ў адну са школ. З часам стаў настаўнікам працы ў школе, дзе і працаваў да пенсіі.

Часта Івана Якаўлевіча запрашаюць выступіць з расказамі пра вайну ў школы, бібліятэкі, і ён ніколі не адмаўляецца. Нядаўна я пабывала ў бальніцы, дзе залечвае ветэран свае раны, але, як і раней, ён зноў збіраецца ў дарогу — наведаць Брэсцкую крэпасць і сустрэцца з баявымі сябрамі з 131-га артылерыйскага палка.

Тамара ФАДЗЕЕВА,
прэзідэнт Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі.

Яраслаўль.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

ПАДАРУНАК З АЎСТРЫІ

Упадарунак ад аўстрыйскіх выратавальнікаў курсанты Гомельскага вышэйшага каманднага вучылішча МНС атрымалі каля паўтара дзесятка тэхнікі для пажаратушэння, выратавання, а таксама аўтамабілі хуткай дапамогі і грузавікі. Даставілі іх сябры з аўстрыйскай зямлі Форарльберг на чале з мэрам горада Ранквайль Хансам Колерам.

НА ЗДЫМКУ: у час асвячэння падараванай тэхнікі сустрэліся старыя знаёмыя — мэр аўстрыйскага горада Ханс КОЛЕР і настаяцель гомельскай Свята-Міхайлаўскай царквы айцец Андрэй.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

«АНЁЛ, КОЖНАГА БЕРАЖЫ»

З нагоды жалобнай даты — чарнобыльскай катастрофы — грамадскія арганізацыі: аб'яднанне інвалідаў "Чарнобыльскае ліхалецце" і фонд кампазітараў — правялі ў сталіцы рэспублікі дабрачынную акцыю "Анёл, кожнага беражы", прысвечаную 15-й гадавіне гэтай трагічнай падзеі.

Ініцыятарамі мерапрыемства, якое стала ўжо традыцыйным, з'яўляюцца прафесар Валерый Дзядзечкін і народны артыст СССР Ігар Лучанок.

У ходзе акцыі "чарнобыльцы" змаглі сустрэцца адзін з адным, абмяняцца карыснай інфармацыяй, пазнаёміцца з прадстаўнікамі тых фірм і арганізацый, што аказваюць ім матэрыяльную дапамогу, атрымалі падарункі.

Закончылася чарнобыльская акцыя ў адным з вячэрніх клубаў сталіцы вялікім канцэртам з удзелам вядучых артыстаў краіны.

Аляксандр ДЫНІКАЎ.

НАТАТКІ ПАСЛЯ БАЛЮ

І СЛАВА ПРАДЗЕДАЎ КЛІЧА

Пасля шматлікіх бітваў вучоныя і афіцэры, інжынеры і рабочыя ў святочны майскі дзень сабраліся на баль.

Менавіта так адзначылі пяцігоддзе стварэння грамадскага аб'яднання "Ваенна-гістарычны клуб "Мінскі пешы полк" ("ВГК "МПП") члены клуба і іх сем'і. Як у эпоху 1812 года, якую рэканструююць уніфармісты Беларусі, распарадчык балю Ілля Ярмаловіч прадставіў паважаных спадарынь і спадароў — супрацоўніка Нацыянальнага музея гісторыі культуры Беларусі, камандзіра "Мінскага пешага палка" Васіля Сапсалева з жонкаю, старшага афіцэра вучэбнага аддзела Ваеннай акадэміі РБ, сцяганосца Аляксея Рачкоўскага з жонкаю, намесніка старшыні прафкама МПЗ Мікалая Кузьміна з дачкою, старшага навуковага супрацоўніка аддзела спецыяльных гістарычных навук НАН Шаміля Бекцінеева...

У праграму балю, як і ў былыя часы, былі ўключаны жартаўлівая гістарычная віктарына, "жывыя карціны", гульня ў фанты і, канешне ж, танцы — вальс і паланез.

Пяцігадовая праца клуба адзначана ўдзелам у ваенна-гістарычных фестывалях у Польшчы, Чэхіі, Літве і нават на радзіме Напалеона — востраве Корсіка. А з 1997 года члены клуба рэгулярна "змагаюцца" на Барадзінскім полі. Паўтара года назад ініцыятыва уніфармістаў знайшла падтрымку ў шэфа палка — дырэктара Мінскага падшыпнікавага завода (МПЗ) Валерыя Пензы. Менавіта дзякуючы магчымасці выкарыстоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу завода для належнага абсталявання клуба, упершыню ў краіне была праведзена рэканструкцыя фрагмента бітвы на Брылеўскім полі каля пераправы праз Бярэзіну, а колькасць "кадравага складу" і кандыдатаў узрасла амаль у чатыры разы.

І хаця да барадзінскіх маштабаў, дзе ўдзельнічаюць да 1 500 уніфармістаў, нам яшчэ далёка, але ўжо ў гэтай першай самастойнай "баталіі" клуб змог выставіць кавалерыйскі эскадрон, які "змагаўся" на баку "французаў". Валерый Пенза перакананы, што да наступнай гадавіны на Бярэзіне ў імітуемай бітве "загаворыць" і свая клубная артылерыя.

Самым актыўным удзельнікам балю былі ўручаны прызы і сувеніры з сімволікай "ВГК "МПП".

Атрымаў такі знак як сімвал доўгага жыцця традыцый і віншаванні з рук камандзіра палка як блаславленне ў эскадрон Беларускага гусарскага палка, што зараз фарміруецца, Яўген, якому споўнілася 18 гадоў.

Напрыканцы балю ўдзельнікі і госці сардэчна дзякавалі галоўнаму ініцыятару і арганізатару гэтага цудоўнага вечара, кандыдату гістарычных навук, навуковаму рэдактару выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя", намесніку прэзідэнта "ВГК "МПП" Таццяне Скрыпчанка.

Мікалай ЛЯБЕДЗІК.

Фота аўтара.

ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ

ДУДУТ
ШЛЯХ ДАК

Дудуткі могуць пачынацца для экскурсантаў па-рознаму: для адных — пагрузкай у аўтобус ля мінскага офіса музея, для іншых — паездкай на аўтамабілі па слуцкай шашы і вузкай сельскай дарозе. Але і ў тых, і ў другіх "ёкае" сэрца, калі яны бачаць зусім, здавалася б, побач сілуэт ветрака — прыехалі! Дык што ж гэта такое — Дудуткі?

Гэта першы ў Беларусі скансен і адзін з першых экамузеяў. І той, і другі тэрмін патрабуюць тлумачэння. Скансен — музей пад адкрытым небам, які быў упершыню створаны ў мінулым стагоддзі ў пасёлку Скансен, адтуль і назва. Зараз у свеце пашыраецца рух за вяртанне ў рэальнае жыццё такіх "рэзервацый мінулага", дзе экспанаты не аддзелены ад наведвальнікаў ні вітрынным шклом, ні стагоддзямі. Тут, як і належыць у экамузеі, няма мяжы паміж экспанатамі і навакольным асяроддзем, паміж дазорцам і наведвальнікам, паміж мінулым і сённяшнім.

Дудуткі — гэта музей, у якім сеюць жыта і пякуць хлеб, падкоўваюць коней і абпальваюць ганчарныя вырабы, вэндзяць вяндліну і гоняць самагон. Усё: пабудовы, прылады працы, механізмы і транспартныя сродкі — аднаўляецца да рабочага стану з наступным практычным прымяненнем. Дудуткі — музей ладу жыцця, дзе вы паглыбляецеся ў свет прыгод і гульні. Але гэта яшчэ і стары маёнтак, беларускі фальварак, падобны на тыя, што існавалі ў краіне на працягу стагоддзяў як сістэма гаспадарання і унікальная культура шляхецкіх падвор'яў.

Што ж такое беларуская шляхта? Гэта прывілеяванае саслоўе, якое мела абавязак — абараняць краіну са зброяй у руках, выступаючы ў паход на ворага. Шляхецкае апалчэнне даўней называлася "пагоняй", адсюль і назва герба з выявай узброенага конніка-рыцара. Беларуская шляхта, як і дваранства ў іншых еўрапейскіх краінах, мела права на ўладанне зямлёй, нашэнне зброі, нават судзіць шляхціца магла толькі шляхта. Але калі нехта з іх выбіраў сабе больш бяспечны занятак — гандаль або рамяство — ён пазбаўляўся шляхецкіх прывілей. Праўда, многія беларускія шляхціцы былі малазямельнымі, па свайму дастатку не адрозніваліся ад сялян, самі апрацоўвалі свае маленькія ўчасткі. Замежнікаў часта шакіраваў від шляхціца, які вёз гной, уваткнуўшы ў яго абавязковы атрыбут — сваю шаблю, без якой не мог паказацца на людзях. І нават калі шляхціц быў бяднейшы за суседняга селяніна, на яго баку абавязкова была прычэплена шабля, а сам ён і жонка фарсілі ў скураных ботах. Нездарма пра такіх "багачоў" існавала прыказка: на двух паноў — адны боты: хто раней устаў, той і абуў.

Так ужо склалася, што Дудуткі шмат гадоў звязаны з імёнамі літаратараў. Тут, у былых Дудзічах, жыў вядомы пісьменнік, гісторык, этнограф, краязнаўца, перакладчык і публіцыст Аляксандр Ельскі (1834—1916), а новае жыццё сённяшняму музею даў таксама пісьменнік Яўген Будзінас. Менавіта ён і ажыццявіў ідэю адраджэння былога фальварка, ператварэння яго ў надзіва ўтульны экамузей, дабіўся выдзялення для яго арганізацыі больш за 160 гектараў зямлі.

Вятрак. Менавіта з яго, а больш дакладна, са знака "Рыцарам журботнага выгляду ўезд забаронены" пачынаецца экскурсія для наведвальнікаў Дудутак. Трэба адзначыць, што такі тып збудаванняў не характэрны для гэтай мясцовасці, тут некалі было два вадзяныя млыны, таму гэты драўляны гмах быў прывезены, зманціраваны і пачаў працаваць да адкрыцця музея, у 1994 годзе. Але і ў яго ёсць свая гісторыя, якую з задавальненнем слухаюць экскурсанты, тым больш, што тут іх чакае першая дэгустацыя (а ўсяго тры): частуюць гарэлкай, салам, хлебам і цыбуляй. Забягаючы наперад, адзначым, што ўсе пачастункі выраблены і вырашчаны ў саміх Дудутках. Для бясстрашных і трывалых наведвальнікаў, якія пажадаюць падняцца на самы верх, у так званую "шапку", арганізоўваецца пошук сюрпрыза — вялізных драўляных лапцей. Але тут мы вымушаны зрабіць яшчэ адно "лірычнае адступленне".

Справа ў тым, што многае залежыць ад кашалька наведвальніка: ён жа можа, прыехаўшы сюды на аўтобусе або на асабістым аўтамабілі, далей адправіцца па маршруту пешшу або наняць раскошную карэту летам або конныя сані зімой. Можна (калі маеш вопыт верхавой язды) папрасіць асядлаць каня, паколькі шлях будзе няблізкі — на "Язычніцкую паляну" (яшчэ яна называецца палянай пікнікоў). Тут стаіць зробленая з дрэва вялікая лазня, дзе можа адначасова адпачыць не менш 10 наведвальнікаў: з драўлянай мэбляю, падвесным (на ланцугах) вялікім сталом, драўлянымі масткамі — непасрэдна да ціхай рачулкі (зімою тут робіцца палонка). Побач — вяндлярні для мяса і рыбы, розныя павеці і шалашыкі, дзе звычайна наладжваюцца пікнікі з шашлыкамі каля вогнішча, дранікамі, блінамі. Пакуль што шумныя гулянні, як гэта бывае, напрыклад, на масленіцу, — з'ява аднаразовая. Але будаўніцтва невялікай гасцініцы ўжо пачалося, і, магчыма, хутка ў гэтым маляўнічым куточку будуць стаяць аўтакараваны. А цэнтр паляны — сухое "язычніцкае" дрэва. Па павер'і, кожны, хто загадае жаданне, павінен завязаць на галіну сваю стужачку або што іншае. Зараз гэтыя "ўпрыгажэнні" калышуцца пад лёгкім ветрыкам і на ніжніх, і на самых верхніх галінах...

І вось, прыемна правёўшы час на маляўнічай паляне, можна тут жа паабедаць па загадзя абмеркаванаму меню — з беларускімі нацыянальнымі стравамі: бульбяной бабкай, мачанкай, дранікамі і іншымі прысмакамі, а можна зрабіць гэта на галоўнай сядзібе, дзе размешчаны рамесныя майстэрні і кухня. Тут жа на плошчы 4,5 гектара не толькі размясціліся пабудовы, але і разбіты невялікі садзік з фруктовых і проста рэдкіх дрэў. Самае цікавае з іх — плакучы ясень, так званае "дрэва, што расце дагары каранямі", бо, калі на галінах няма лісця, то яны вельмі падобныя на карані. Па ўсёй тэрыторыі музея расстаўлены драўляныя скульптуры — у 1997 годзе тут праходзіў пленэр разьбы па дрэву "Жывое дрэва". Майстры пражылі ў Дудутках 20 дзён, а затым пакінулі тут свае творы.

Зрэшты, экскурсія па сядзібе пачынаецца не каля садзіка, а каля... самагоннага апарата. Гэта нават не апарат, а цэлы міні-заводзік, у свой час канфіскаваны міліцыяй у нейкага прыхільніка Бахуса, а затым перададзены ў музей пасля адпаведнага афармлення дакументаў і атрымання ліцэнзіі на вытворчасць і дэгустацыю. Менавіта тут нараджаецца вядомы на ўсю акругу напой, першы ўспамін пра які можна знайсці яшчэ ў рукапісах XII стагоддзя. Тады яго гналі ў манастырах і выкарыстоўвалі як вельмі моцны лекавы і дэзінфекцыйны сродак. У Дудутках яго гатуюць са сваіх прадуктаў: атрымліваюць солад з прарошчанага зерня, сушаць, прымолваюць і гатуюць брагу. У выдатнай якасці прадукта асабіста пераконваецца кожны наведвальнік, бо каля апарата адбываецца другая дэгустацыя: да чаркі самагону падаюць, таксама мясцовай вытворчасці, хлеб, салёны агурок і мёд з асабістай пчальні. І калі ўжо мы загаварылі пра ўласныя прадукты, то пройдзем адразу ў хлебапякарню, дзе сабраны прадметы, звязаныя з таямніцай нараджэння хлеба.

Менавіта нараджэння, таму што з даўніх часоў існавалі цэлыя абрады, прысвечаныя яму. Замешвалі хлеб у дзяжы, зробленай з планак рознага колеру, дзе выкарыстоўваліся разнастайныя пароды дрэва, як правіла —

ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ

АКРЫНІЦ...

і сасн бо елка. Пры гэтым сімва аў мужчынскі пача- а сасн о елка — жаночы. А цесту трэбна было даспя- і на жаночае і накрывалі чынск жухом) або наад- т — б жа павінен быў дзіцц рычым, дзяжа нао- была ам прадметам у до- калі ў яе не было, то ніхто пазы сваю: яна магла ыўдз даваць потым дрэн- хлеб. Калі старая дзяжа зірав , то гаспадыня спа- у "зн іна" з ёю новую: ывала едзве адным ручні- і пак а на ноч, каб тая дала эты добрага хлеба. упная ямніца" — само хле- чэнне эта павінна была ць сам спадыня — нявестка свякр Перад гэтым — аба- ова п а ў пазні, ставіць тр было ў добрым роі. К доме былі гаварлі- дзеці старыя, іх прасілі па- нацц проста выйсці на , там о нават шэпт мог уз- нічаць якасць хлеба. Нез- ма ж кнай вёсцы ведалі, у атры аецца самы смачны , і та падыня карысталася гул вагай.

ны, у залеж- еўраджайныя , дзе мука адыг- злучальную ролю, верхам лічыўся вя- , які дасягаў часам ў дыяметры, таму ыло абавязкова па- сваякоў. Мясілі такі акамі, а далонькамі е падымаў руку на уды самагон (каб ых было вясёлым), (каб было салод-

алоўны прадмет у — печ. У Дудутках ая, двухподавая, гэ- ёй можна выпякаць оханаў. Калі іх ставі- на першым выціска- о апошнім. Калі гас- ўкі бохан з крыжам, прыйшоў час ставіць здарма на высокім выведзены надпіс: а пекара — аддасі ось тут і праходзіць цыя: наведвальні- аюць уласны хлеб, "Наогул, — га- ар гэтага унікальна- о Сарока, — мы хо- наведвальнікам не ыцыі нацыянальнага аў, але і пра гасцін- ацца беларусы і да

, напрыклад, тэрня, дзе можна лядзець, як працу- але і самому сесці руг, вырабіць улас- або распісацца на яшчэ сырым вырабе, каб пасля абпалу застаўся сувенір на памяць аб наведванні Дудутак. Побач — стэнды з узорамі прац, дзе ёсць проста цудоўныя, накшталт "спарыша" — двух спараных гаршкоў (для першай і другой стравы), злучаных ручкай, каб было зручней несці ў поле, дзе працуе гаспадар, або рукамыйніка на два носікі. Ёсць і гліняная патэльня, маслёнка і гэтак далей. У кузні, адноўленай па праекту XVI стагоддзя, ёсць не толькі ўсё неабходнае, але і паходная кузня напалеонаўскіх часоў, якую тады кавалерысты бралі ў паходы, каб мець магчымасць зрабіць падкову і падкаваць каня непасрэдна ў полі. А ў сталярным цэху сабрана цэлая калекцыя даўнейшых прадметаў, рэстаўрыраваных майстрамі. Асабліва шмат розных маслабоек, вельмі важных у старадаўніх гаспадарках. І як сувязь старога з новым цудоўны музей-майстэрня рэтрааўтамабіляў, дзе сабраны амаль усе савецкія аўтамабілі, шмат імпартных, некаторых з іх ва ўсім свеце налічваюцца адзінкі.

* * *

Недахоп месца на газетнай паласе не дазваляе зрабіць наш аповед больш падрабязным, таму мы не гаворым пра пародзістых коней, поні і ослікаў, пакатацца на якіх могуць усе жадаючыя, а то і ўзяць рэгулярныя ўрокі верхавой язды.

Адным словам, час пралятае хутка, а ўражанняў хапае надоўга. Шкада толькі, што каштуе такая экскурсія, па беларускіх мерках, дарагавата — у межах 25 долараў ЗША на чалавека. Зрэшты, а што сёння таннае!..

Юрый ВАЛОШЫН.

НА ЗДЫМКАХ: розныя куточкі музея-фальварка Дудуткі.

Фота **Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.**

ЮБІЛЕЙ

ВІТАЛІ Алега ЛОЙКУ

У СЛОНІМСКІМ РАЁННЫМ ДОМЕ КУЛЬТУРЫ АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМ, ВУЧОНЫМ, ДАСЛЕДЧЫКАМ, ПЕРАКЛАДЧЫКАМ, ЛАЎРЭАТАМ ДЗЯРЖАЎНАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ПРЭМІІ Алегам ЛОЙКАМ З НАГОДЫ ЯГО 70-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ.

Алег Лойка ў 25 гадоў стаў кандыдатам філалагічных навук, у 38 — доктарам, у 40 — прафесарам. А ў 1989 годзе Алег Антонавіч абраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ён паранейшаму працуе на кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя, узначальвае савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па філалогіі. І ўсё ж Алег Лойка вядомы перш за ўсё як пісьменнік. "У мяне кніг больш, чым мне гадоў", — прызнаўся юбіляр.

З першых паэтычных зборнікаў: "На юначым шляху", "Задуменныя прапескі", "Дарогі і летуценні" — стала зразумела, што ў беларускай літаратуры з'явіўся таленавіты аўтар. Потым — новыя і новыя выданні...

У славутай маскоўскай серыі "Жизнь замечательных людей" выйшлі на рускай мове дзве кнігі Алега Лойкі: "Янка Купала" (1982 год) і "Скорина" (1989 год).

У апошні час у Слонімскай друкарні пабачылі свет кнігі: "Неўміручасць", "Ушанаванне", "Галгофа".

Як перакладчык Алег Антонавіч падрыхтаваў дзве анталогіі польскай паэзіі, кнігу нямецкай паэзіі "Сузор'е".

Разам з жонкай Ліліяй Іванаўнай наш знакаміты зямляк ганарыцца сваімі дзецьмі: сын Павел — кандыдат гістарычных навук, працуе на гістарычным факультэце БДУ, узначальвае кафедру; дачка Антаніна — дактарантка Маскоўскага універсітэта, працуе цяпер у Кракаўскім універсітэце (Польшча).

Ірына ВАЛЫНЧЫК.

ПРЫЗНАННЕ

Віктар КАПЫЦЬКО: «У ПАСТАНОЎЦЫ СПЕКТАКЛЯ ДРОБЯЗЕЙ НЕ ІСНУЕ...»

Віктар Капыцько — прадстаўнік малодшага пакалення беларускіх кампазітараў, хаця ўзрост для творчай асобы — паняцце адноснае. На сённяшні дзень ён вядомы як аўтар вялікай колькасці твораў розных жанраў. Сярод іх оперы, араторыі, кантаты; аркестравая і камерна-інструментальная музыка; вакальныя цыклы, хары; музыка да тэатральных пастановак і кінафільмаў.

Адна з апошніх работ В. Капыцько — музыка да спектакля купалаўскага тэатра "Князь Вітаўт" (паводле п'есы А. Дударава). Як лічыць кампазітар, лёс пастаноўкі можна назваць шчаслівым. Спектакль, створаны рэжысёрам В. Раеўскім, мастаком Б. Герлаванам і харэографам Н. Дударавай, пачынаючы з прэм'еры, выклікае неаслабную цікавасць не толькі ў беларускага гледача (Гран-пры на фестывалі "Белая вежа" ў 2000 годзе), але і ў расійскага (на Міжнародным фестывалі імя Чэхава ў Маскве).

Поспех спектакля шмат у чым абумоўлены музычным "радам": В. Капыцько ўдалося вельмі пераканаўча адлюстраваць шматпланавую дынамічную драматургію "Князя Вітаўта". Музыка гучыць не за кадрам, а ўбірае ў сябе ўсе падзеі, што адбываюцца на сцэне. Яна ж стварае і асаблівую эмацыянальную атмасферу спектакля, і архаічны дух, які ўвасоблены гучаннем купальскіх песень, званоў, грыгарыянікі, гукамі аргана...

Уласна кажучы, мае ўражанні ад спектакля і ад яго музыкі сталі падставай для размовы з кампазітарам — пра яго супрацоўніцтва з драматычным тэатрам.

— Мне вядома, што вы — аўтар музыкі больш чым да 20 спектакляў, якія пастаўлены на сцэнах Беларусі, Расіі, Германіі... Здаецца, схільнасць "мысліць тэатральна" выявілася ў вас яшчэ ў гады навучання ў Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі...

— Са спектакляў тых гадоў я б выпучыў "Павольнае шкло" паводле фантастычнага апавядання Боба Шоў, "Бег" паводле М. Булгакава, "Егіпецкія ночы" па А. Пушкіну. Вельмі плённым было супрацоўніцтва з рэжысёрам "Бегу" Юрыем Барысавым: у далейшым ён стаў сааўтарам лібрэта абедзвюх маіх опер: "Дзяўчынка, якая наступіла на хлеб" і "Яго жонкі".

— Пачаткам вашай працы ў беларускіх тэатрах стала пастаноўка спектакля "Хлопчык з зялёнымі пальцамі" паводле М. Дрыона ў магілёўскім тэатры?

— Не толькі. Я напісаў шмат музыкі да лялечных спектакляў у працэсе супрацоўніцтва з Юрыем Сарычавым: "Меч анёла" паводле п'есы Сідарука, "Снежная каралева" па вядомым творы Андэрсена... У 1992 годзе прыняў удзел у пастаноўцы п'есы "Тры нажы краіны Вэй", здзейсненай у мінскім Рускім драматычным тэатры. Пазней стварыў музыку да спектакля "Ружовы матылёк", прэм'ера якога адбылася ў Цюмені.

З 1996 года пастаянна супрацоўнічаю з купалаўскім тэатрам. У выніку гэтага з'явіліся "Князь Вітаўт" і "Піраміда Хеопса" (рэжысёр і аўтар п'есы — Ю. Ломаўцаў). Цяпер ідзе падрыхтоўчая праца да пастаноўкі спектакля "Чорная панна Нясвіжа" паводле п'есы А. Дударава, рэжысёр В. Раеўскі.

— Што, на ваш погляд, забяспечвае тэатральнай пастаноўцы поспех у асяроддзі гледачоў, доўгае сцэнічнае жыццё?

— Для спектакля заўсёды было вельмі важным узаемаразуменне, сааўтарства трох асоб — мастака, кампазітара, рэжысёра. Для мяне незабыўнае супрацоўніцтва з выдатным расійскім рэжысёрам Георгіем Таўстаногавым. Мне пашчасціла стварыць музыку да экранізацый яго тэатральных пастановак "Дзядзька Ваня" (1986) і "Апошні горача закаханы" (1989). Стасункі з гэтым чалавекам, успаміны пра яго вельмі дарагія для мяне.

Прыемна працаваць з В. Раеўскім, у нас з ім амаль адсутнічаюць розначытанні ў пытаннях формы і акустыкі. Але я перакананы, што і роля мастака ў спектаклі па значнасці не саступае рэжысёрскай. У свой час вялікае ўражанне на мяне зрабіла сумесная праца з мастаком еўрапейскага ўзроўню і надзвычайнага інтэлекту Зіновіем Марголіным. Я прыйшоў да высновы: мастак — гэта мозг спектакля, ён на семдзесят працэнтаў забяспечвае поспех пастаноўкі.

А ўвогуле, у пастаноўцы спекталя дробязей не існуе...

Наталля ПРАФАЦІЛА.

САПРАЎДНЫ ЦУД

ЗАМІРАТОЧЫЛА ІКОНА МІКАЛАЯ ЦУДАТВОРЦА

У кватэры жыхаркі Светлагорска Ніны Яўсеенка пачала міратачыць ікона Мікалая Цудатворца, выразаная з дрэва сынам гаспадыні.

Як паведаміў настаяцель мясцовага праваслаўнага Петрапаўлаўскага храма протаіерэй Ігар Лазоўскі, упершыню міратачэнне было выяўлена 30 мая, пасля чаго ікону перанеслі ў царкву. У цяперашні час на іконе працягваюць з'яўляцца кропелькі пахучай масляністай вадкасці, што прыцягвае ў храм шматлікіх вернікаў і цікаўных.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

НАМ НЕАБЫЯКАВЫ ЛЁС РАДЗІМЫ

Нядаўна госцем нашай рэдакцыі была Людміла АНУС, член беларускага таварыства "Сябры", якое працуе ў Нарве з 1999 года. Людміла жыве ў Эстоніі ўжо 28 гадоў. Трапіла туды па размеркаванні пасля заканчэння інстытута, выйшла замуж за эстонца, выгадавала сына. Працуе інжынерам у фірме, што выпускае мэблю. Дарэчы, значная частка прадукцыі ідзе на экспарт у краіны Еўропы. З Расіяй, нягледзячы на блізкае суседства, не гандлююць, бо не вырашаны праблемы з двайным падаткаабкладаннем, у выніку чаго прадукцыя робіцца неканкурэнтаздольнай. Жыццё ў Эстоніі Людміла называе скрозь капіталістычным: платная медыцынская дапамога (у працуючых ёсць страхоўка, якая да нядаўняга часу распаўсюджвалася і на сваякоў, а цяпер — не), платная вышэйшая адукацыя (толькі асабліва здольныя вучацца за кошт дзяржавы, многія жыхары Нарвы, якія маюць расійскае ці беларускае грамадзянства, накіроўваюць сваіх дзяцей у ВНУ гэтых краін; аднак з расійскім дыпломам працу складана знайсці). Але, як мне падалося, цяжкасці станаўлення новага жыцця ў Эстоніі гэтая абаяльная жанчына ўспрымае з разуменнем: каб лепш жыць, трэба шмат працаваць.

— Мабыць тым, хто жыве на Радзіме, цяжка ўявіць нашы пачуцці. Ведаеце, па нядзелях на працягу гадзіны ў Нарве ідзе беларуская радыёпраграма. Вельмі цікавыя для нас навіны з Мінска. Можа не паверыце, але часам ад беларускіх спеваў, наогул, гучання роднай гаворкі на вочы наварочваюцца слёзы. Сапраўды, каб зразумець, што значыць для цябе родная зямля, трэба апынуцца далёка ад яе. Тады разумееш, што страціў.

Нас, нарвскіх беларусаў, аб'ядноўвае не толькі вялікая цікавасць да ўсяго беларускага, але і проста добрыя, шчырыя сяброўскія адносіны. У мяне здарылася непрыемнасць — абрабавалі кватэру. Нашы беларусы сабралі грошы і дапамаглі мне. Мы імкнемся падтрымліваць адзін аднаго, асабліва старых — нават дапамагаем апрацоўваць агароды.

Важны аспект нашай дзейнасці — знаёмства з Беларуссю ўсіх жыхароў горада. Нядаўна праводзілі Дні беларускай культуры. У нас адбылася выстава беларускай мастачкі Астраумавай, канцэрт кампазітара з Мінска Алены Прахінай. Сярод беларусаў праводзіліся віктарыны на веданне беларускай мовы.

Мы вельмі ўдзячныя вашай газеце за падтрымку беларускіх дыяспар і інфармацыю пра іх жыццё. Заўсёды ўважліва чытаем рубрыку "Зваротная сувязь". Вельмі цікава даведвацца, як жывуць іншыя беларусы, раскіданыя лёсам па ўсім свеце. Вельмі дапамагаюць нам руска-беларускія слоўнічкі, што час ад часу вы даяце ў газеце. А калі б друкавалася больш беларускіх песень (сучасных, народных) ды з нотамі, мы былі б толькі рады і ўдзячны. Справа ў тым, што ў нас існуе пэўны дэфіцыт інфармацыі. Не хапае літаратуры, песеннікаў у тым ліку.

— Якая асноўная праблема ў вашай дзейнасці?

— Мяне турбуе, што ў нашым таварыстве мала моладзі. Яна прыходзіць толькі на вечарыны. Іншыя нашы мерапрыемствы чамусьці мала яе цікавяць. Мне здаецца, гэта праблема ўсіх нацыянальных таварыстваў. Як правіла, у іх дзейнасці бяруць актыўны ўдзел людзі, старэйшыя за 50 гадоў. Магчыма, сітуацыю змяніла б стварэнне нядзельнай школы. Ёсць адукаваныя людзі, якія пры пэўнай падрыхтоўцы маглі б выкладаць дзецям і беларускую мову, і гісторыю Беларусі. Але, як звычайна, існуе праблема грошай. Арэнда памяшкання занадта дарагая, каб мы маглі зараз думаць пра школу для дзяцей. Ды і літаратура таксама каштуе нямала.

— Як вам падалася Беларусь у гэты прыезд?

— Зноў-такі кідаецца ў вочы надзвычай чысты і ўтульны цэнтр Мінска. Прыемна, што ў вас гарыць Вечны агонь на плошчы Перамогі. У Эстоніі кажуць, што не хапае газу, але ж хутчэй за ўсё гэта палітыка, бо тут да падзей Вялікай Айчыннай вайны стаўленне вельмі неадназначнае. Мне прыемна, што на Беларусі людзі памятаюць, якой цаною дасталася перамога. Беларусам Эстоніі неабыякавы лёс Радзімы.

Гутарыла
Алена СПАСЮК.

Людміла АНУС сярод сяброў і аднадумцаў.

МІНСК, ЗАХАРАВА, 28. ДОМ ДРУЖБЫ

ПОГЛЯД НА МІНСК СА ШВЕЙЦАРЫІ

У Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі адбылася выстава "Мінскія праспекты".

Гісторыя стварэння яе пачалася роўна год таму, калі два выпускнікі Акадэміі тэатральнага мастацтва ў Цюрыху Штэфан Ліхтэнштайгер і Ханэс Лео Маер прыехалі ў Мінск і ў межах праекта партнёрства Аргау — Беларусь на працягу трох дзён кіравалі творчым семінарам па тэатральнай сцэнічнай імправізацыі. У гэты ж час узнікла жаданне адлюстраваць свае ўражанні ў спантанных фотаздымках і тэксце. Гэты праект аўтары назвалі "Сейчас". Асноўным прынцыпам гэтай працы стала паралельнасць рознага ўспрымання ўбачанага. Тэкст амаль нідзе не пераказвае адлюстраванага на фотаздымках. Візуальная частка — гэта фрагменты нашай рэчаіснасці: тэлефон-аўтамат, начная рэклама, бра ў нумары гатэля, твары людзей, подпісы на месцы трагедыі на станцыі метро "Няміга". Апошняе так уразіла гасцей са Швейцарыі, што абодва прысвяцілі гэтаму і фатаграфію, і тэкст. А тэкст — як абрыўкі думкі, на першы погляд, не звязаныя паміж сабой, але ж толькі на першы погляд:

Жалезныя ружы,
А квітнеючыя яблыні
Усё роўна пахнуць.

Бязногі мужчына
Паказвае свае жалезныя
абрубкі.

Побач з ім
Дзве прыгажуні
на "хадулях",
На высокіх абцасах.
Між імі ляжыць свет.

Дваццаць два спантанныя здымкі, дваццаць дзве імправізацыі, аб'яднаныя ў выставу "Мінскія праспекты", — вынік працы, якую Штэфан Ліхтэнштайгер і Ханэс Лео Маер аддалі на суд мінчан.

На адкрыцці выставы прысутнічалі першы сакратар пасольства Швейцарыі ў Польшчы і Беларусі спадар Клётцлі, сябры фотаклуба "Мінск", студэнты мінскага універсітэта культуры.

НА ЗДЫМКАХ: аўтары выставы (злева направа) Штэфан ЛІХТЭНШТАЙГЕР і Ханэс Лео МАЕР.

Тэкст і фота
Яўгена КАЗЮЛІ.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

МІЖНАРОДНАЯ СУСТРЭЧА СКАЎТАЎ У МІНСКУ

У Еўропе і Амерыцы скаўтынг існуе ўжо болей за 90 гадоў. Ён даўно стаў не толькі традыцыйнай формай арганізацыі вольнага часу моладзі, але і адным з асноўных спосабаў выхавання юнакоў і дзяўчат ад 12 да 20 гадоў. Скаўцкі рух — гэта сістэма прагрэсіўнага самавыхавання і як вынік — развіццё самастойнасці і адказнасці асобы, здольнай прымаць рашэнні і фарміраваць сваю сістэму жыццёвых каштоўнасцей.

У Расію і Беларусь скаўтынг прыйшоў у пачатку XX стагоддзя, потым быў выціснуты піянерскай арганізацыяй, якая, дарэчы, запазычыла асноўныя прынцыпы ў скаўтаў. У пачатку 90-х гадоў у Беларусі, адной з першых на постсавецкай прасторы, дзякуючы сумесным намаганням дзяржавы і асобных энтузіястаў, быў адроджаны скаўцкі рух. У 1999 годзе ўрачыста адзначалася яго 10-годдзе. Беларуская рэспубліканская скаўцкая асацыяцыя з'яўляецца членам Сусветнай арганізацыі скаўцкага руху (САСР).

Для беларускіх скаўтаў, як і для ўсіх скаўтаў свету, вызначальнымі элементамі выхавання з'яўляецца жыццё ў адзінстве з прыродай, навучанне праз працу і гульню, кодэкс паводзін, выкладзены ў скаўцкіх законах, падтрымка дарослых як сяброў і дарадчыкаў.

Каб паўней рэалізаваць названыя прынцыпы і пашырыць узаемадзеянне паміж скаўтынгам і грамадствам, у 1997 годзе ў Ерэване на ўстаноўчым з'ездзе быў заснаваны Еўразійскі скаўцкі рэгіён, які аб'яднаў скаўтаў дзяржаў СНД. А праз чатыры гады ў Мінску з 11 па 13 мая 2001 года адбылася першая Еўразійская скаўцкая канферэнцыя. Не выпадкова для правядзення гэтага міжнароднага форуму выбрана сталіца Беларусі. Мінск заўсёды быў цэнтрам інтэграцыйных працэсаў краін Садружнасці. У канферэнцыі прынялі ўдзел дэлегаты з Расіі, Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Таджыкістана, Малдовы і Украіны, а таксама назіральнікі са Швейцарыі (у тым ліку і генеральны сакратар САСР Жак Марэйльён) і ЗША. З беларускага боку гасцей і дэлегатаў прымаў арганізацыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі прэзідэнт скаўтаў Беларусі Ігар Касцевіч і іншыя лідэры грамадскіх арганізацый рэспублікі. У праграму канфэрэнцыі ўвайшлі выбары кіраўніцтва Еўразійскага скаўцкага рэгіёна, састаўленне доўгатэрміновага плана работы па розных накірунках скаўтынга ў XXI стагоддзі. На рабочай сустрэчы са старшынёй Дзяржкамітэта па справах моладзі А. Пазняком, лідэрамі грамадскіх арганізацый Беларусі і парламентарыямі былі акрэслены актуальныя праблемы палітыкі моладзі ў краінах СНД. Канферэнцыі папярэднічаў семінар "Новы скаўтынг для новых грамадстваў: новыя выклікі", асноўнымі тэмамі якога сталі "Сям'я — як мэтавы аб'ект скаўтынга", "Узаемадзеянне нацыянальных скаўцкіх арганізацый з дзяржавай і няўрадавымі арганізацыямі ў краінах рэгіёна Еўразіі", "Арганізацыйнае будаўніцтва ў нацыянальных скаўцкіх арганізацыях рэгіёна" і іншыя.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт: "Мне здаецца, што ў падзеях XX стагоддзя часам было занадта шмат зместу, далёкага ад боскай прыроды чалавека. Цынізм і высакамер'е, жорсткасць і пагарда да людзей, непавага да прыроды і забыццё традыцый свайго народа нярэдка станавіліся прыкметай часу. А ў сістэме выхавання скаўтаў з яе кансерватыўнымі маральнымі каштоўнасцямі, нязменным рамантызмам і навыкамі жыцця ва ўмовах дзікай прыроды людзі знаходзілі той парадак, які, як яны спадзяваліся, зможа таксама ўпарадкаваць і светапогляд іх дзяцей. Можа таму сярод шматлікіх дзіцячых і падлеткавых арганізацый XX стагоддзя арганізацыя скаўтаў застаецца міжнародным сацыяльна-педагагічным доўгажыхаром".

Любоў МАЗУР.

ХРАМЫ БЕЛАРУСІ

Новы касцёл (на здымку) адкрыўся ў Мастах. На думку спецыялістаў, гэты храм сучаснай забудовы — адзін з лепшых ва Усходняй Еўропе. Ён яшчэ адно сведчанне аднаўлення духоўнага жыцця на Беларусі сярод прадстаўнікоў розных канфесій.

Фота **Віктара ТАЛОЧКІ.**

БелТА

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

У. КАРАТКЕВІЧ ЗАСТАЕЦЦА САМЫМ ПАПУЛЯРНЫМ ПІСЬМЕННІКАМ БЕЛАРУСІ

Летась шырока святкавалася 70-годдзе з дня нараджэння цудоўнага беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. У Дамах культуры ладзіліся вечарыны, у інстытутах і універсітэтах студэнты перад аўдыторыяй чыталі вершы і ўрыўкі з прозы У. Караткевіча. Не засталіся ў баку ад такой падзеі і найбольш салідныя выдавецтвы Беларусі. Нягледзячы на складанае фінансавае становішча, адразу пяць кніг убачылі свет.

Выдавецтва "Юнацтва" выпусціла кнігу казак. Большасць з іх была надрукавана ўпершыню. Яшчэ пры жыцці Уладзімір Караткевіч неяк абмовіўся галоўнаму рэдактару "Юнацтва" Уладзіміру Карызне, што прынясе некалькі казак. Але не паспеў: праз паўгода памёр. Так гэты выпадак і забыўся. А перад 70-годдзем з дня нараджэння пісьменніка рэдактару згадалася размова, і ён звязаўся з роднай сястрой У. Караткевіча. Яна параіла з'ездзіць у музей Якуба Коласа. Там быў знойдзены ліст да народнага пісьменніка і 11 казак. Тады яшчэ студэнт Кіеўскага універсітэта звяртаўся да Якуба Коласа з адной мэтай, каб той даў параду — пісаць яму ці не. Так гэтыя казкі і трапілі ў новую кнігу. Дарэчы, яна выдавалася ў цяжкіх умовах. Не хапала грошай ні на паперу, ні на мастацкае афармленне. Але мастак Славук зрабіў малюнкі задарма. У выніку выйшла вельмі прыгожая і цікавая кніга для дзяцей.

Выдавецтва "Беллітфонд" распачало новую серыю пад назвай "Беларускі гістарычны раман". У якасці першай кнігі чытачу быў прадстаўлены раман Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні". Дзякуючы гэтай кнізе, можна апынуцца ў сярэднявеччы і паглядзець, як там жылі людзі. Галоўны рэдактар упэўнены, што гэта не апошні раман Караткевіча ў серыі, таму што гістарычных твораў у пісьменніка хапае.

Выдавецтва "Лазурак" выдала вялікую па аб'ёму кнігу "Аповесці. Вершы". Галоўным чынам, яна разлічана на маладое пакаленне. Каб выпусціць кнігу, спатрэбілася 10 000 долараў. Такая сума для прыватнага выдавецтва была непасільнай, і давялося звярнуцца па дапамогу на фабрыку каляровага друку. Там аказалі садзейнічанне, і кніга з'явілася на паліцах у кнігарнях.

Яшчэ трэба адзначыць выхад кнігі вершаў "Быў. Ёсць. Буду", выдадзенай "Мастацкай літаратурай", а таксама кнігу Аркадзя Русецкага "Уладзімір Караткевіч. Праз гісторыю ў сучаснасць".

Усе кнігі ўжо амаль разышліся і акупіліся. А гэта значыць, што такога выдатнага пісьменніка, як Уладзімір Караткевіч, любяць і чытаюць.

Павел САМЕЦ.

УРАЖАННІ

«ЗЛОЎЛЕНАЯ ІЛЮЗІЯ ЁСЦЬ ПРАЎДАЙ НАШАЙ»

РОЗДУМ ПРА ПАЭЗІЮ Надзеі АРТЫМОВІЧ

У свядомасці чытача даўно склаўся пэўны стэрэатып адносна так званай "жаночай паэзіі". Гэтыя вершы разглядаюцца, як правіла, з усталяваных пазіцый. "Жаночую" лірыку надзяляюць эмацыянальнасцю, экспрэсіўнасцю, падкрэсліваюць багатую духоўнасць гераіні, імкненне да гармоніі ў сабе і навакольным свеце. Традыцыйнымі лічацца тэмы кахання, жаночай і мацярынскай долі, ухваляецца тонкае адчуванне прыроды... Але сучасную літаратуру не раз праціналі промні творчасці трагічных і велічных у сваім мастацкім гарэнні жанчын. Можна згадаць хоць бы імёны Марыны Цвятаевай і Ларысы Геніюш, паэтак, у якіх надзвычайная душэўная сіла злучалася з магутнымі інтэлектуальнымі магчымасцямі, вострым крытычным розумам. Без творчасці такіх жанчын літаратура шмат страціла б у сваёй харызматычнай прыцягальнасці, многія сферы чалавечага бытавання засталіся б нераскрытымі.

Надзея Артымовіч — беларуская паэтка, якая жыве і творыць у сучаснай Польшчы. Яе унікальная лірыка займае асобае месца як у тамтэйшай, так і ў сучаснай беларускай літаратуры.

«СВЕТ, УКІНУТЫ Ў БЕЛЬСКУЮ КАЗКУ»

Родным месцам, дзе прайшлі лепшыя гады і дзе да гэтага часу жыве Надзея Артымовіч, з'яўляецца невялікі гарадок на Беласточчыне Бельск-Падляскі. Не проста ўсведамлялася сваё месца ў свеце, клаўся шлях да творчасці будучай паэткі. Жыццё не раз уносіла свае папраўкі ў мары і надзеі ўражлівай дзяўчыны. Прыходзілася і цяжка працаваць, і з перапынкамі вучыцца. Пасля заканчэння курсаў у Беластоку Надзея паступае вучыцца ў Варшаўскі універсітэт.

Н. Артымовіч належыць да другога пакалення "белавежцаў". У 50-х—60-х гадах на Беласточчыне распачало сваю дзейнасць Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), узбагачалася нацыянальнае прыгожае пісьменства літаратурнай суполкай "Белавежа". Аб'яднанне, якое групавала творчую беларускую інтэлігенцыю, стварала атмасферу, дзе найбольш ярка мог праявіцца талент маладой пісьменніцы. Даследчыкі даўно вызначылі ў творчасці беластоцкіх пісьменнікаў асноўныя матывы, характэрныя тэмы. У паэзіі Н. Артымовіч яны завуаліраваны чыста асобаснымі перажываннямі, таму праяўляюцца апасродкавана. І ўсё ж уважлівы чытач беластоцкай літаратуры пазнае самоту індывідуума, які не здольны проста і лёгка ўсталявацца ў грамадстве, адчуе знаёмыя ноты тугі па светлых дзіцячых уяўленнях: *"дарог да бацькаўшчыны//не выпрастуем//, не пераскочым"*. У вершах, дзе малюецца вобраз роднага мястэчка *("Бельск — ікона малітва сон жыццё")*, самай трывалай прыкметай, нязменнай дэталлю пейзажа з'яўляецца неба: *"П'ю прагна//Як цудадзейнае лякарства//Тваё неба мой Бельск"; "мой дзень у бельскім небе"*.

«ДАЙЦЕ НАМ ГЭТЫЯ КРЫЛЫ»

Ужо ў першым апублікаваным вершы "Ой ляцелі гусі" (1970) выразна выявіліся тыя асноўныя паэзіятворчыя прынцыпы і прыкметы, што пасля трывала замацуюцца ў далейшай творчасці паэткі. Гэты верш — выдатны па свайму мастацка-вобразнаму вырашэнню твор, які і ў ідэйна-зместавых адносінах, і па стылёвых прыкметах нельга назваць "спробай пяра", ці "вучнёўствам". Першы радок з выразнай фальклорнай асновай задае тон усяму тэксту:

Ой ляцелі гусі
грайце
завіруйма ў танцы
мы ўбачым іх крылы
вялікія
недасяжныя
дайце нам гэтыя крылы
мы ўзляцім
над шырокім прасторам
будзем смяяцца
які наш свет малы

У яркай экспрэсіўнай форме злучаюцца рэальнасць і мара, неверагоднасць цуда і радасць надзеі. Колькі энергіі, маладой прагнасці да жыцця, гатоўнасці да крэатыўнай дзейнасці, веры ва ўласныя магчымасці чуецца ў гэтых перарывістых радках.

Трэба сказаць, што, нягледзячы на складаныя ўмовы існавання, немагчымасць рэгулярна друкавацца на Беларусі, суполка "Белавежа" працягвала сваю дзейнасць, і кнігі найбольш яркіх і таленавітых беластаччан, хоць з вялікімі часавымі прамежкамі, усё ж маглі пабачыць свет. Першы зборнік Н. Артымовіч быў польскамоўны і меў шматзначную назву: **"У сне, у болі слова"** (Беласток, 1979). Творчасць беларускай аўтаркі выклікала цікавасць у чытачоў і крытыкаў, якія ўпэўнена правялі тыпалагічныя падабенствы лірыкі беластаччанкі і наватарскай польскай паэзіі XX стагоддзя. Беларускамоўны томік вершаў **"Роздумы"** (Беласток, 1981) прэзентаваў арыгінальнага мастака слова, пісьменніцу, якая адшуквала яшчэ не зведаныя нацыянальнай літаратурай шляхі даследавання рэчаіснасці.

«У СНАХ ЗАБЫЦЬ ПРА ЯВУ»

Паэзію Н. Артымовіч практычна немагчыма дыферэнцыраваць па тэмах, выдзеліць асноўныя ці нязменныя накірункі мастацкага даследавання. Думаецца, што ўся лірыка "белавежскай" паэткі ўяўляе суцэльны маналог-споведзь чалавека, які іншым чынам не можа выказацца. Таму і каханне, напрыклад, у вершах прадстаўлена як пакутлівая, безнадзейная радасць, што абавязкова праміне, пакінуўшы толькі адчуванне трагедыі і неразумення. Паэтка не верыць у станоўчыя вынікі любых намаганняў, таму яе пазіцыя ў дачыненні да эмпірычнай рэальнасці надзвычай пасіўная. Таму гераіня твораў "белавежанкі" ўсё настойлівей імкнецца заглыбіцца ва ўласную экзістэнцыяльную прастору.

так
я ў крузе
незачараваным...
я хіба жыццём
ачаравана
расчаравана...

Лірыка раскрывае ці, хутчэй, толькі падводзіць да разумення прычын і вынікаў усіх катаклізмаў, што разрываюць душу нашай сучасніцы. Аднак трэба заўважыць, што на большасць пытанняў паэтка не знаходзіць і нават не шукае адказаў. Усе іх можна прадбачыць, і ёсць упэўненасць, што новыя веды — інтэлектуальныя, духоўныя, эстэтычныя — прынясуць толькі расчараванне, боль, непазбежнае набліжэнне катастрофы:

тыя што ўпалі на зямлю
не разумеюць зачыненых
родных вокан
не разумеюць імклівых
вятроў
не разумеюць неабходных
дзвярэй
тыя што ўпалі на зямлю
бачаць хворае неба

«ЁСЦЬ ТОЛЬКІ ЦЕНЬ СІМБАЛАЎ І АДЧУЖАНАСЦЬ ВЯЛІКАЯ»

Надзея Артымовіч ніколі не была "высокапрадукцыйным" мастаком слова. Акт творчасці, працэс узнікнення верша для яе — глыбока інтымнае перажыванне. Новы зборнік паэткі з'явіўся ў пачатку дзевяностых — **"Сезон у белых пейзажах"** (Беласток, 1990). Асаблівасць твораў Н. Артымовіч у іх пазачасавым існаванні. Таму ў кожным зборніку ствараецца ўражанне храналагічнага вакууму, калі паасобны тэкст амаль ніяк не суадносіцца ні з гістарычным часам, ні з развіццём грамадства, ні з фактамі асабістай біяграфіі. Для чытача Беларусі паэзія Н. Артымовіч па-сапраўднаму адкрылася толькі ў 1993 годзе, калі з'явілася кніга **"З неспакойных дарог"**. Гэты томік вершаў мае цыклічную структуру, але паэтычны матэрыял, відаць, супраціўляўся такой рэгламентацыі, таму назвы цыклаў — "Ой ляцелі гусі", "Варажу з вятроў", "Рассыпаныя пейзажы", "У блізкіх крыніцах", "На скрыжаванні дарог" — здолелі толькі прыкладна акрэсліць абсягі пакутлівага мастацкага пошуку.

Паэты паміраюць тады
калі ўсміхаецца добры
час для паперы
паэты паміраюць тады
калі знойдзены дакладныя
адрасы
сытыя жэсты
паэты паміраюць тады
калі нараджаюцца чорныя
лістапады

«КАЛІ ЛЮБІШ ПАЭЗІЮ, МАЎЧЫ»

Безумоўна, чалавек, які спрычынены да творчасці, мастак, адзначаны лёсам, так ці інакш імкнецца асэнсаваць і ацаніць свае дасягненні. У Н. Артымовіч чытач не знойдзе твораў аб паэзіі, насычанай квяцістымі метафарамі, месійнымі матывамі. Роздум беластаччанкі над сваім вершам напоўнены пропускамі і замоўчваннямі:

з вуліц
з зямлі
з неба
з...
з пекла
... і прадчуванняў
.....
.....
.....
мой верш
правакацыя. Правакуе прыгожае. Чаму так мала людзей цягнуцца да вершаў? Чалавек не любіць быць справакаваным. Сапраўдная паэзія (мастацтва) змушае чытача да адмаўлення ад беззаганнага самавобраза, заснаванага на гэтак званай жыццёвай філасофіі", — так разважае паэтка.

«ВЕРУ Ў ВЕЧНАЕ ХАРАСТВО»

У канцы дзевяностых гадоў з'явіліся два новыя зборнікі: польскамоўны **"Лагодны час"** (Люблін, 1998) і **"Адплывае спакойнае неба"** (Беласток, 1999). Паэтка практычна не карыстаецца сучаснымі наватворамі, моднай тэрміналогіяй. Разам з тым яна настойліва эксперыментуе з формай і структурай тэксту, пазбягае знакаў прыпынку, кампазіцыйна ўзмацняючы сэнсавую нагрузку асобных слоў, радкоў, частак верша. Пры выразна наватарскім падыходзе да знешняй структуры верша, выкарыстоўванні унікальных прыёмаў паэтычны свет Н. Артымовіч грунтуецца на традыцыйных літаратурных вобразах і сімвалах. Уключаныя ў мастацкі твор, яны шмат у чым змяняюць звыклую сэнсавую нагрузку, перастараюцца ў іншы змест, таму ў свядомасці ўзнікае пэўнае сутыкненне звыклага і незвычайнага. Гэтым самым верш уяўляецца адначасова зразумелым і неразгаданым.

Ікона
лістападаўскі снег
блакітны ранак

сон аднакрылы і лёгкі
у блакітным люстры
стаю
хвіліна прыгажосці
акіян хараства
хвіліна

Творчасць беластоцкай паэткі Надзеі Артымовіч да гэтай пары з'яўляецца недастаткова прачытанай і даследаванай, і яшчэ менш знаёмай бачыцца неардынарная асоба пісьменніцы. Таму, яшчэ раз звярнуўшыся да унікальнай лірыкі беластаччанкі, уважлівы і занепакоены чытач атрымае несамавітую магчымасць зазірнуць у таямніцы мастацкага свету, паспрабаваць разабрацца ў супярэчнасцях уласнай душы.

Анатоль РАМАНЧУК.

Гродна.

ХОБІ

Гэтую кветку, якая называецца аморфафалусам, віцяблянка, супрацоўніца "Белэлектрамантажу" Наталля БРУЕВА, пасадзіла дзесяць гадоў назад. І нядаўна на захапленне калег кветка ўпершыню зацвіла. Значыць, аморфафалус — жыхар засушлівых раёнаў Усходняй Індыі — прыжыўся і ў Беларусі.

Фота **Аляксандра ХІТРОВА**, БелТА.

ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫТАНКА

ЧЭРВЕНЬ — ПАРА, КАЛІ ЦАЛУЮЦЦА ЗОРЫ

Травы пахнуць кветкамі,
Кветкі пахнуць зорамі,
Зоры над палеткамі —
Лесам і азёрамі.

Пятро ГЛЕБКА.

Закончыўся май, усё наўкола ўкрыта багатай сакавітай зеляніною. Доўгімі становяцца дні і зусім кароткімі такія ж цёплыя духмяныя ночы. Прырода бы спецыяльна затрымлівае надыход цемры, даючы чалавеку магчымасць атрымаць асалоду ад цудоўнай прыгажосці чэрвеньскіх дзён. І не паспее дагарэць як след развітальная вячэрняя зара, а на гарызонце праглядваюцца пасвятлелыя абрысы пяшчотна-ружовай палосы ўзыходзячага досвітку. Ранішняя зара спяшаецца змяніць вячэрнюю. У народзе гавораць: гэта пара, калі цалуюцца зоры.

Асабліва прыгожая ў гэты перыяд прырода. Суцэльныя кілімы з густога шматтраў'я і мноства кветак на ўвесь далягляд усцілаюць жыватворную зямлю. Пачынаюць налівацца сокам на садовых дрэвах плады, з кожным днём цяжэюць, згінаюць сваёй важкасцю тонкае голле. Дружна разрастаюцца пасевы сінявокага лёну і пшаніцы, што ўстае суцэльнай сцяною, пагойдваючыся пад ветрам. А канюшынавае поле — у ярка-малінавых галоўках-кветках, напоўненых нектарам. Над "чароўным дыванком" віецца мноства пчол, чмялёў, матылькоў, якія збіраюць каштоўны дар прыроды і напаўняюць паветра мяккім звонам і ўстойлівым водарам мёду.

На лугах на ўсе лады стракоча шматлікае племя конікаў.

А вось птушак чуваць значна менш. У большасці з іх у гнёздах з'явіліся птушаняты. Ім цяпер не да песень — толькі паспявай пракарміць ненажэрнае патомства. Усяго за два-тры тыдні птушаняты дасягаюць памераў дарослых асобін.

Да паўтары сотні дрэў абследуе даўгахвостая сініца толькі за адну гадзіну. Больш за пяцьсот порцый корму дастаўляе ў гняздо мухалоўка, і ў кожнай не адно, а дзесяткі насякомых. Для стрыжа праляцець тысячу кіламетраў за светлавы дзень — проста дробязь, звычайная справа. І ў рацыёне — выключна шкоднікі садоў, лясоў і палёў.

У гэты час нават зязюля не кукуе. Карціць спытаць: чым жа яна заклапочана? Яйкі ж махлярка ў чужыя гнёзды падкідвае. Тым не менш зязюля — вельмі карысная птушка. Сотнямі здзёўбвае і з'ядае яна шкодных вусеняў, асабліва валасатых, якімі ўсе іншыя птушкі проста грэбуюць. Перыяд гэты супадае з выхадам у колас ячменю. І кажуць, быццам зязюля "папярхнулася" асцюком. Але асцюкі тут зусім не прычына, зязюля занятая працай: не ведаючы стомы, збірае вусеняў.

Паспяваюць на лясных палянах ягады. Спачатку яркачырвоныя суніцы, за імі — чарніцы і буякі. Так і вабяць да сябе апетытныя маленькія шарыкі. Іх ахвотна дзяўбуць лясныя птушкі. Нават драпежныя звяры, што ў іншы час харчуюцца выключна жывёльнай ежай, спажываюць цяпер незвычайныя для сябе ласункі. Як гэта ні дзіўна, ягады ядуць куніцы, гарнастаі, лісіцы, барсукі. Што тут гаварыць, нават мядзведзі ў гэты час з задавальненнем ласуюцца ягадамі, з асобай асалодай "пасвяцца" ў малінніках.

У чэрвені з'яўляюцца першыя сапраўдныя грыбы — каласавікі. Што ж гэта за грыбы такія? У навуковай літаратуры пра іх нібыта і не гаворыцца. Сапраўды, каласавікі — назва агульная, зборная, і называюцца яны так таму, што вырастаюць якраз у перыяд каласавання жыта. Гэта баравікі, падбярозавікі, падасінавікі, лісічкі. Але іх усё роўна называюць аднолькава — каласавікі.

Але нядоўгі перыяд росту каласавікоў. Так што, як толькі выйшла жыта ў колас, не марнуй часу, грыбнік. Толькі адзін-два тыдні парадуюць грыбы аматараў ціхага палявання, і з'явяцца яны пасля толькі месяцы праз два — у жніўні і па кастрычнік. Праўда, будзе іх тады мноства. Але гэтае пары яшчэ дачакацца трэба.

Вячаслаў СТОМА,
натураліст-даследчык.

КРЫЖАВАНКА АД Святланы ФАЦЕЕВАЙ

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ.

1. Жывёліна сямейства катоў. 3. Балет Я. Глебава. 5. Пустыня ў Манголіі. 7. Злакавая расліна. 9. Тоўсты брус, умацаваны вертыкальна. 10. Савет народных дэпутатаў на Украіне. 11. Прэснаводная рыба. 13. Хімічны элемент. 15. Крэсла манарха. 16. Від спорту. 17. Агародная расліна. 19. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Індыі. 20. Стары ... баразны не псуе. *(Прымаўка).* **21. Міні-фільм у суправаджэнні песні-шлягера. 23. Планета Сонечнай сістэмы. 25. Дэкаратыўны тканы выраб. 26. Агароджа з жэрдак. 28. Атмасферныя ападкі. 30. Драпежная начная птушка. 31. Від аўтагонак. 32. Дарога, вымашчаная каменем. 34. Частка камплекту скрыпкі, віяланчэлі. 36. Птушка сямейства крумкачыных. 37. Інертны газ. 38. Невялікая пячора. 39. Шматструнны музычны інструмент.**

ПА ВЕРТЫКАЛІ.

1. Стыль спартыўнага плавання. 2. Тысяча брацікаў звязаны, адным поясам перавязаны. *(Загадка).* **3. Афіцэрскае званне. 4. Опера Д. Вердзі. 5. Статак жывёлы. 6. Дзяржава ў Азіі. 7. Вялікая драпежная птушка. 8. Жаночае адзенне ў Індыі. 11. Пасудзіна з адной ручкай. 12. Прыток Дуная. 13. Мужчынскае параднае адзенне. 14. Спосаб бегу каня. 17. Вялікі яркі метэор. 18. Абалонка, у якой вусень ператвараецца ў кукалку. 21. Спартыўны бег па няроўнай мясцовасці. 22. Фанабэрыстасць, ганарлівасць. 23. Беларускі пісьменнік, аўтар аповесці "Палескія рабінзоны". 24. Зімовая павозка. 26. Сельскагаспадарчая прылада. 27. Народны паэт Беларусі. 28. Шахматная фігура. 29. Урачыстая дзяржаўная песня. 32. Марское паруснае судна XVIII—XIX стагоддзяў. 33. Востраў у Міжземным моры. 34. Рака ў Францыі, прыток Роны. 35. Дзяржава ў Амерыцы.**

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ Ў № 20

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ. 1 Сіроп. 5. Пакос. 7. Пладуха. 9. Лімонка. 11. Біямаса. 13. Шапачка. 1. Салака. 16. Ляўкас. 18. Крыга. 20. Крыжанка. 22. Каракурт. 24. Антрацыт. 27. Лесасека. 29. Асака. 30. Ангара. 33. Граніт. 36. Траскун. 40. Стаянка. 41. Лангуст. 42. Снежань. 43. Асіна. 44. Качка.

ПА ВЕРТЫКАЛІ. 1. Селен. 2. Панарама. 3. Паліп. 4. Вусач. 5. Пляцоўка. 6. Смала. 7. Парша. 8. Абвал. 10. Мора. 12. Акра. 14. Арык. 15. Стронга. 17. Строкат. 18. Карта. 19. Акула. 21. Жар. 23. Кос. 25. Анаконда. 26. Барс. 28. Апалонік. 31. Ніва. 32. Атлас. 33. Гніль. 34. Ідку. 35. Ласка. 37. Адсеў. 38. Камар. 39. Сетка.

РОДНЫЯ КРАЯВІДЫ

Горад Маларыта. Брэсцкая вобласць.

БелТА.

«Голас Радзімы»

Намеснік галоўнага рэдактара
Галіна УЛІЦЁНАК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь; Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі; Беларускае таварыства па сувязях з су-

РЭДАКЦЫЯ:
Намеснік галоўнага рэдактара Галіна УЛІЦЁНАК.
Адказны сакратар Таццяна КУВАРЫНА.
Рэдактар аддзела — член рэдкалегіі Яўген ЛЕЦКА.
Рэдактар аддзела Алена СПАСЮК.
Аглядальнік Віктар МАЦЮШЭНКА.
Спецыяльныя карэспандэнты Яўген КАЗЮЛЯ, Алесь МЯСНІКОЎ,
Нэлі ПРЫВАЛАВА.
Рэдактар-перакладчык Святлана КАРПУЧОК.
Стыльрэдактар Ірына КАЗЛОВА.
Тэхнічны рэдактар Данута РАКАВЕЦ.

Наш адрас: 220005, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 213-31-97 (тэл.-факс), 213-32-80, 284-76-56, 213-37-82.
Адрас у INTERNET: http: //www.voiceland.unibel.by. E-mail: voiceland@tut.by

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», не заўсёды супадаюць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 81.
Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Тыраж 2 021 экз.
Зак. 1475.
Падпісана да друку 11.6.2001 г. у 12.00.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку». (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).